■ Парламенцкі дзённік

# ПАКАЗАЦЬ СЯБЕ

## Падчас зімовага пасяджэння ПА АБСЕ адбылася прэзентацыя нашай краіны

**Учора парламенцкая дэлегацыя Беларусі на чале з намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Баляславам ПІРШТУКОМ завяршыла ўдзел у зімовым пасяджэнні Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Яно праходзіла ў сталіцы Аўстрыі Вене з 23 па 24 лютага.**

Адна з найважнейшых для нас падзей на гэтым мерапрыемстве — прэзентацыя Беларусі ў якасці краіны правядзення 26-й штогадовай сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ. Яна будзе праходзіць у Мінску з 5 па 9 ліпеня бягучага года. Асноўная тэма — «Умацаванне ўзаемнага даверу і супрацоўніцтва ў імя міру і працвітання ў рэгіёне АБСЕ».

На стэндзе, які арганізаваў Нацыянальны сход Беларусі, размешчаны лістоўкі з агульнай інфармацыяй пра будучую сесію, пра нашы атэлі, пра краіну, яе эканамічны і турыстычны патэнцыял. Ёсць прэзентацыйная прадукцыя прадпрыемстваў — брэндаў Беларусі.

Што да самога зімовага пасяджэння ПА АБСЕ, то, як паведамляе прэс-служба ніжняй палаты, Баляслаў Пірштук прыняў удзел у пасяджэнні Пастаяннага камітэта арганізацыі. Сярод іншага, там была агучана інфармацыя аб падрыхтоўцы маючых адбыцца сёлета мерапрыемстваў ПА АБСЕ.



Фота прэс-службы Палаты прадстаўнікоў.

На пасяджэнні Агульнага камітэта ПА АБСЕ па эканамічных пытаннях, навуцы, тэхналогіі і навакольным асяроддзі адбылося выступленне **старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Нацыянальнага сходу Беларусі Валерыя ВАРАНЕЦКАГА** на тэму «Кіраванне прыроднымі рэсурсамі: рашэнне праблем воднай бяспекі і барацьба са зменай клімату». Валерый Варанецкі адзначыў важную ролю, якую адыгрывае Беларусь у агульнаеўрапейскіх маштабах у справе захавання водна-балотных угоддзяў, падкрэсліўшы, што беларускія балоты называюць «лёгкімі» Еўропы. Ён таксама звярнуў увагу замежных калег на яшчэ адно ўнікальнае багацце нашай краіны — значныя запасы прэсных падземных водаў, якія экспертамі прызнаюцца аднымі з найлепшых у свеце.

Падчас зімовай сесіі нашы дэлегаты правялі сустрэчы з кіраўніцтвам ПА АБСЕ і сваімі калегамі — парламентарыямі краін — удзельніц арганізацыі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Партнёры

# І бізнес, і... бульба

## Прэзідэнт Грузіі — пра развіццё адносін з нашай краінай

**Адносіны паміж Беларуссю і Грузіяй набылі новы імпульс. Аб гэтым у інтэрв'ю праграме «Буйным планам» на тэлеканале «Беларусь 1» заявіў прэзідэнт Грузіі Георгій МАРГВЕЛАШВІЛІ.**

«Я вельмі актыўна рыхтуюся да паездкі ў Беларусь, таму што пачынаючы з 2015 года адносіны паміж нашымі краінамі, якія маюць велізарны патэнцыял, набылі новы імпульс», — сказаў Георгій Маргвелашвілі.

Паводле яго слоў, новы этап у адносінах паміж дзяржавамі адкрыў візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Грузію ў красавіку 2015 года. «Тая адкрытасць, якая ёсць у Аляксандра Рыгоравіча, тая канцэнтрацыя на канкрэтных пытаннях, якія мы вырашаем на карысць народаў, актывізавалі адносіны паміж нашымі краінамі на ўзроўні міжурадавых структур і на ўзроўні двухбаковых адносін. Акрамя гэтага, пачаліся больш актыўныя бізнес-працэсы, — адзначыў Георгій Маргвелашвілі. — Я вельмі рады, што гэтыя працэсы рухаюцца наперад, і адносіны не толькі паміж лідарамі краін і ўрадамі, але і паміж народамі будуць набываць больш актыўны фармат».

Георгій Маргвелашвілі звярнуў увагу, што Беларусь і Грузія маюць вялікія магчымасці для пашырэння супрацоўніцтва ў розных сферах. Аднак краіны скарысталіся яшчэ не ўсімі. «Калі мы паглядзім на наш тавараабарот, Беларусь — адзінаццаты па велічыні партнёр Грузіі. Я ўпэўнены, што гэту лічбу мы зможам палепшыць і павысіць. Паглыбленне адносін паміж нашымі дзяржавамі будзе стымуляваць і бізнес», — упэўнены прэзідэнт.

Цікавы факт з інтэрв'ю: прэзідэнт Грузіі вырасціў на сваім агародзе падораную кіраўніком беларускай дзяржавы Аляксандрам Лукашэнкам бульбу. «Аляксандр Рыгоравіч мне падарыў беларускую бульбу, якую я пасадзіў. Я яе вырасціў», — расказаў прэзідэнт Грузіі. Разам з тым ён прызнаўся, што ў параўнанні з тым ураджаем, які атрыманы на ўчастку кіраўніка беларускай дзяржавы, яго ўраджай больш сціплы. «У яго такія вялікія мяшкі, і бульбачка вялікая выйшла. У мяне так добра не атрымалася. Але так, я займаюся сельскай гаспадаркай», — адзначыў ён.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**
*yushkevich@zviazda.by*

■ Лідары

# Лепшыя ў рэйтынгу рэгіёнаў

**У Міністэрстве антыманапольнага рэгулявання і гандлю падвялі вынікі працы рэгіёнаў у частцы гандлю, грамадскага харчавання і бытавога абслугоўвання насельніцтва за мінулы год.**

У ліку лідараў — Брэсцкая, Гомельская вобласці і Мінск. Першыя дзве вобласці занялі першыя пазіцыі ў рэйтынгу адпаведна. Мінск за мінулы год з лідзіруючай пазіцыі апусціўся на два месцы ўніз — трэці радок у рэйтынгу. Магілёўская, Мінская і Гродзенская вобласці сінхронна згубілі па адной пазіцыі ў параўнанні з вынікамі 2015 года і занялі чацвёртае, пятае і шостае месцы адпаведна. Замыкае рэйтынг Брэсцкая вобласць.

Нагадаем, што вынікі працы падводзяцца шляхам складання рэйтынгу рэгіёнаў на падставе 13 ключавых паказчыкаў развіцця ніжэйназваных відаў дзейнасці: рознічны і аптовы тавараабарот, чысты прыбытак і рэнтабельнасць продажаў, доля тавараў айчыннай вытворчасці ў рознічным тавараабароце, рост цэн, стан запазычанасці перад пастаўшчыкамі тавараў і г.д.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

# ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

## Прычынай гібелі Кім Чэн Нама стаў нервова-паралітычны агент VX

Зводны брат паўночнакарэйскага лідара Кім Чэн Ына, Кім Чэн Нам, паводле папярэдніх звестак, быў забіты з дапамогай высокатаксічнага хімікату, вядомага як нервова-паралітычны агент VX. Як удакладнілі ў паліцыі Малайзіі, падчас даследавання хімікі-эксперты ўзялі мазкі з твару і вачэй забітага. Нервова-паралітычны агент VX па класіфікацыі ААН з'яўляецца зброяй масавага знішчэння. Кім Чэн Нам быў забіты 13 лютага ў аэрапорце Куала-Лумпура, адкуль ён збіраўся вылецець у Макаа да сваёй сям'і.



## Барака Абаму імкнуцца вылучыць кандыдатам на пасаду прэзідэнта Францыі

Прыхільнікі былога лідара ЗША Барака Абамы дамагаюцца вылучэння яго кандыдатуры на пасаду прэзідэнта Францыі. Актывісты развесілі па Парыжы плакаты з партрэтам Абамы, надпісам «Obama17» і заклікам наведаць аднайменны вэб-сайт, дзе можна падпісаць петыцыю, якая «пераканала б Абаму» прыняць удзел у выбарах. Мэта актывістаў сабраць мільён подпісаў. «У часы, калі Францыя збіраецца масава галасаваць за ўльтраправага кандыдата, мы ўсё яшчэ можам падаць гэтай планеце ўрок дэмакратыі, абраўшы прэзідэнтам замежніка», — адзначаецца ў паведамленні на сайце.

## У Чэхіі мяркуюць увесці адпачынак для бацькі па доглядзе за дзіцем

Дэпутаты чэшскага парламента прынялі папраўку да заканадаўства аб увядзенні адпачынку для бацькоў пасля нараджэння дзіцяці. Маладыя бацькі маглі б скарыстацца тыднёвым адпачынкам па доглядзе за дзіцем на працягу шасці тыдняў пасля яго нараджэння. Пры гэтым, як і ў маці, захоўваецца 70% іх зарплаты. Мэтай папраўкі называецца імкненне матываваць бацькаў да больш актыўнага ўдзелу ў доглядзе за нованароджаным. Законапраект яшчэ павінен прайсці абмеркаванне ў верхняй палаце парламента, сенаце, а потым паступіць на подпіс да прэзідэнта рэспублікі.

**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

**ИЗВЕЩАЕТ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ПОМЕЩЕНИЯ**

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| Наименование объекта, краткая характеристика, местонахождение объекта | право заключения договора аренды сроком на 3 года:<br>- капитального строения, инв. №450/С-1102 – ангарный склад (площадью 477,0 кв.м), заборов (площадью 418 кв. м) и ворот с калитками (площадью 20 кв. м) по адресу: г. Слоним, ул. Советская, 103А, корп. 3;<br>- капитального строения, инв. №450/С-1100 – здание для хранения материалов (площадью 156,5 кв. м) по адресу: г. Слоним, ул. Советская, 103А;<br>- капитального строения, инв. №450/С-1103 – здание для хранения (площадью 385,7 кв. м) по адресу: г. Слоним, ул. Советская, 103А, корп. 1 |
| Начальная цена продажи | 5945,38 р. (пять тысяч девятьсот сорок пять рублей тридцать восемь копеек) |
| Размер ежемесячной арендной платы либо применяемые коэффициенты | коэффициент в зависимости от спроса на недвижимое имущество, его технического состояния и коммерческой выгоды – 2,0 |
| Сумма задатка | 595 р. (пятьсот девяносто пять рублей) |
| Условия аукциона | целевое назначение арендуемых помещений – складские, производственные помещения |
| Продавец | отдел материально-технического снабжения<br>УП «Барановичское отделение Белорусской железной дороги», 225410, г. Барановичи, ул. Фроленкова, 52Б,<br>тел. 8-0163-45-20-08 |
| Организатор торгов | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209,<br>тел.: 45-05-38, 41-98-32 |
| Условия оплаты | плата за право заключения договора аренды – в течение 7 рабочих дней до даты заключения договора аренды |
| Срок заключения договора аренды | не позднее 10 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| Номер р/с для перечисления задатка | 301 257 917 0017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225. |

**Аукцион состоится 27 марта 2017 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:
- заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;
- *юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;
- *индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;
- *юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:
- представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;
- физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;
- представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Последний день приема заявлений – 21 марта 2017 г. до 15.00.**

***Телефон для справок: 45-05-38 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»***
*http://grodnoino.by/*

**Уважаемые акционеры ОАО «Центр Моды»**

30 марта 2017 года состоится годовое общее собрание акционеров открытого акционерного общества «Центр Моды»,
**Место нахождения: г.Минск, пр. Победителей, д.1.**
**Время начала собрания 11.00.**
**Собрание пройдет по адресу:**
**г. Минск, пр-т Победителей, 1, 2-й этаж, комн. 18.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2016 год.
2. Отчет наблюдательного совета Общества о работе в 2016 году.
3. Отчет ревизионной комиссии по результатам финансовой и хозяйственной деятельности Общества за 2016 год. Заключение по результатам проведения ежегодной ревизии Общества.
4. Рассмотрение аудиторского заключения по итогам проведения ежегодного аудита Общества за 2016 год.
Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2016 год.
5. Распределение прибыли по итогам работы Общества за 2016 год.
6. О выплате дивидендов за 2016 год.
7. О направлениях использования чистой прибыли на 2017 год.
8. Избрание членов наблюдательного совета Общества.
9. Избрание членов ревизионной комиссии Общества.
10. Об установлении размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества

*Проект решения с необходимыми обоснованиями и пояснениями будет доступен для ознакомления акционерам по месту нахождения Общества (г. Минск, пр. Победителей, 1, к. 21 с 22.03.2017 (в рабочие дни: с 9.30 до 12.30 и с 13.00 до 16.00) и по 30.03.2017 с 9.00. до 11.00.*

*Информация о деятельности Общества за отчетный период будет доступна для ознакомления акционерам по месту нахождения Общества (г. Минск, пр. Победителей, 1, к. 18 (приемная) с 09.03.2017 в рабочие дни: с 9.30 до 12.30 и с 13.00 до 16.00) и по 30.03.2016 с 9.00. до окончания собрания.*

*Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет проводиться 30.03.2017 по адресу: г.Минск, пр-т Победителей, 1, 2-й этаж, кабинет 18 с 10.00 до 10.45.*

**Для регистрации при себе иметь следующие документы:**
**акционеру общества (физическое лицо) – паспорт, руководителю юридического лица, являющегося акционером, – документ, подтверждающий его должностное положение, и паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.**

Список лиц, имеющих право на участие в собрании, составлен по данным реестра акционеров на 23.02.2017 УНП 100649747